


# БЕЛАРУСЫ ЗАМЕЖЖА: УПЛЫЎ НА ВОБРАЗ БЕЛАРУСІ

Генадзь Коршунаў

Цэнтр новых ідэй | Сакавік 2024

# РЭЗЮМЭ

Вобраз любой краіны ў грамадскай свядомасці краін-суседзяў складаецца з розных чыннікаў. Не апошняй у іх шэрагу стаіць дзейнасць дыяспары, прадстаўнікі якой маюць магчымасць уплываць на ўспрыняцце сваёй краіны ў замежжы і ў паўсядзённых стасунках, і падчас культурніцкіх альбо палітычных мерапрыемстваў, і праз афіцыйныя звароты ад імя дыяспары. У беларускім кейсе, дзе грамадства выразна супрацьпастаўляе сябе аўтарытарнай уладзе Аляксандра Лукашэнкі, роля дыяспары ў фармаванні вобраза Беларусі на міжнароднай сцэне мае выключнае значэнне. Шмат у чым дзякуючы менавіта высілкам дыяспары (палітыкам, экспертам, актывістам) у замежным палітыкуме ў асноўным ёсць разуменне, што “беларусы ≠ Лукашэнка”.

Праз тое ўзнікаюць пытанні, як менавіта беларусы замежжа ці беларуская дыяспара ўплываюць на вобраз Беларусі ў тых краінах, дзе яны знаходзяцца? Як увогуле магчыма ўплываць на яго фармаванне? Хто мусіць гэтым займацца?

Для адказу на гэтыя і іншыя пытанні Цэнтр новых ідэй правёў серыю глыбінных інтэрв’ю з беларускімі актывістамі Польшчы, Літвы і Грузіі.

У краінах, дзе зараз групуецца новая беларуская дыяспара, няма такога адзінага абагульненага інфармацыйнага вобраза ці суб’екта, як “Беларусь”.

У Польшчы, Літве, Грузіі цяпер суіснуюць як мінімум тры розныя, хаця і ўзаемазвязаныя, але даволі самастойныя семантычныя наборы, якія маюць свае змест, крыніцы і дынаміку. Галоўныя наборы сэнсаў датычацца наступных беларускіх суб’ектаў:

- Беларусь як дзяржава і як рэжым Лукашэнкі;
- беларускае грамадства і дыяспара як яго актыўная частка;
- беларусы як асобы і прадстаўнікі свайго народа, сваёй нацыі.

# БЕЛАРУСКІЯ ВОБРАЗЫ

Ад краіны да краіны “беларускія вобразы” адрозніваюцца перш за ўсё праз актуалізацыю зместаў з розных сэнсавых набораў і апеляцыю да розных гістарычных перыядаў.

Так, у прыватнасці ў Грузіі дасюль у пэўнай ступені пашыраны той абстрактна-стэрэатыпны вобраз Беларусі, што пачаў фармавацца яшчэ дзесяцігоддзі таму. Гэты вобраз складаецца з “сацыяльнай дзяржавы”, працаўнікоў на заводах, чысціні і агульнага парадку ў краіне – тых каштоўнасцяў, якія асабліва блізкія старэйшаму пакаленню. У пэўным сэнсе такі вобраз ёсць прадуктам і лукашэнкаўскай прапаганды, і прарасейскай пазіцыі кіроўнай партыі, якая транслюецца афіцыйнымі медыямі, і нават досведу асабістых кантактаў з яшчэ савецкага часу.

> *(У Грузіі)... усе мала разумеюць нешта пра Беларусь, але вобразы ў моладзі і сталых людзей розныя.*
>
> *Грузія-Польшча, рэспандэнтка ва ўзросце да 30 гадоў.*

Сярод больш ліберальнай па сваіх каштоўнасцях грузінскай моладзі больш распаўсюджаныя веды і пра беларускія пратэсты 2020-га года, і пра прычыны тых пратэстаў, і пра рэпрэсіі рэжыму супраць грамадства. Праз тое і спачуванне Беларусі, якая змагаецца з дыктатурай, з боку грузінскай моладзі большае. Але найбольшую спагаду выказваюць хіба выхадцы з акупаваных Расеяй Абхазіі і Паўднёвай Асеціі, якія бачаць пэўныя паралелі паміж сваёй радзімай і Беларуссю.

> *Старэйшае пакаленне, постсавецкае, у іх ёсць свой станоўчы вобраз беларусаў, заснаваны на асабістым вопыце і сувязях... І ёсць, хутчэй, апазіцыйны вобраз – у моладзі, якая больш ліберальная і практычна не ведае расейскай мовы. Яны ведаюць пра рэпрэсіі ў нас, пра барацьбу за дэмакратычныя каштоўнасці.*
>
> *Грузія, рэспандэнт 30-50 гадоў.*

У Польшчы вобраз Беларусі мае больш выразны характар, дзе з аднаго боку – дзяржава і рэжым Лукашэнкі, з другога – простыя людзі і беларускае грамадства. На ўзроўні краіны Беларусь успрымаецца, хутчэй, як тая, што захопленая дыктатурай, але змагаецца з ёй. Важнымі фактарамі, якія правакуюць пазітыўнае стаўленне да “пратэставай” Беларусі, з’яўляюцца як шматлікія сваяцкія сувязі палякаў з жыхарамі Беларусі (і цяпер, і пакаленні таму), так і гістарычныя паралелі, якія палякі бачаць паміж сваёй эпохай “Салідарнасці” і сучаснымі беларускімі працэсамі.

> *У асноўным у (польскім) акадэмічным асяроддзі вельмі лаяльна ставяцца да беларусаў, бо палякі праходзілі падобнае. Яны памятаюць, што мы маем агульную гісторыю. Могуць не ведаць канкрэтных момантаў, што адбываецца ў Беларусі з палітвязнямі ці якія рэпрэсіўныя законы прымаюцца. Але ўвогуле выдатна ставяцца да беларусаў.*
>
> *Польшча, рэспандэнт ва ўзросце да 30 гадоў.*

Пэўна, варта асобна адзначыць станоўчы вобраз беларускіх НДА сярод польскіх калег. Фармаванню менавіта такога стаўлення паспрыялі высокая актыўнасць і эфектыўнасць беларускіх арганізацый падчас наладжвання працэсаў дапамогі ўкраінскім уцекачам у 2022-ім годзе, калі беларусы шчодра дзяліліся сваім багатым досведам у справе дапамогі пацярпелым і эвакуантам.

*Сярод палякаў адносіны да нашых НКА як да прафесіяналаў нават палепшыліся. Раней было: “Давайце мы вас павучым”. А калі ўбачылі, як мы працуем з валанцёрамі нават без ведання мовы ці дакументаў, – а рабілі шмат і на вакзалах, і на межах, і ў цэнтрах размеркавання – вельмі дзівіліся. Палякі былі вельмі здзіўленыя. Павага вырасла.*

*Польшча, рэспандэнт 30-50 гадоў.*

Самая складаная сітуацыя з беларускімі вобразамі, асабліва апошнім часам, складаецца ў Літве. З падачы палітыкаў правых поглядаў (на меркаванне рэспандэнтаў) у масавай свядомасці жыхароў гэтай краіны пашыраюцца абвінавачванні беларусаў у прыхільнасці да ідэй “радыкальнага ліцвінізму”. Пакуль такія закіды маюць збольшага абагулены, дэперсаналізаваны характар і высоўваюцца, хутчэй, супраць беларускай дыяспары цалкам.

*Калі пачалася кампанія з ліцвінізмам – пачалася дынаміка, сталі баяцца. Яны маленькі народ, баяцца, што мы адбяром Вільню. На гэта вельмі ўплывае прапаганда.*

*Літва, рэспандэнт ва ўзросце пасля 50 гадоў.*

*Літоўцы вельмі пужаюцца ідэі ліцвінізму, хаця яе разганяюць усяго чалавек 10. І самі беларусы пра гэта (пра ліцвінізм) нічога не кажуць.*

*Літва-Польшча, жанчына ва ўзросце да 30 гадоў.*

Новы “ўнутрыпалітычны” погляд на беларусаў як на пагрозу фактычна засланіў сабой і вобраз Беларусі як краіны, дзе адбываюцца рэпрэсіі супраць грамадства, і самога беларускага грамадства, якое змагаецца з рэпрэсіўным рэжымам Лукашэнкі.

*Іншы вобраз звязаны з феноменам 2020-2021 гадоў. Вялікае пытанне, ці склаўся тут цэласны вобраз. Тады ўплывала настальгія па ўласнай мары, па сваёй барацьбе за свабоду... Гэты вобраз досыць хутка панік.*

*Літва, рэспандэнт ва ўзросце 30-50 гадоў.*

На ўзроўні асабістых стасункаў абвінавачванні пакуль не даходзяць. Тут беларусы і як канкрэтныя асобы, і як прадстаўнікі беларускай нацыі працягваюць карыстацца рэпутацыяй працавітых, адказных і дысцыплінаваных людзей. Увогуле на такім паўсядзённым узроўні стаўленне да беларусаў можа быць лепшае, чым да прадстаўнікоў іншых славянскіх дыяспар (і расейскай, і ўкраінскай).

Агульнымі асаблівасцямі для ўсіх трох краін з'яўляюцца два моманты:

- даволі абстрактнае ўяўленне аб узроўні рэпрэсій у краіне (у скрайнім варыянце: "у Беларусі ўжо ўсё сціхла" ці "рэпрэсаваць за лайкі немагчыма, вы перабольшваеце");
- станоўчае стаўленне да беларусаў на міжперсанальным узроўні (на вучобе, на працы, у асабістых стасунках).

## ДЫНАМІКА ВОБРАЗАЎ

Калі казаць пра ўплыў значных падзей апошняга часу на "беларускія вобразы" ў Польшчы, Літве і Грузіі, то відавочна наступнае:

- па-першае, 2022-гі год шмат у чым перакрыў уздзеянне года 2020-га;
- па-другое, і ўплыў 2022-га года пачынае саступаць пад уздзеяннем пазнейшых падзеяў.

У кожнай краіне гэта адбываецца па-свойму і мае свае наступствы.

Так, саўдзел Беларусі ў расейскай агрэсіі супраць Украіны, пэўна, найменш адбіўся на польскім успрыманні "беларускіх вобразаў". Праз большую пашыранасць беларускага парадку дня ў польскай грамадскай думцы (прымусовая пасадка самалёта Ryanair, міграцыйны крызіс на ўсходніх межах Польшчы, рэпрэсіі супраць польскай меншасці ў Беларусі і г.д.) і адасабленне беларускага грамадства ад рэжыму Лукашэнкі складзеныя раней "беларускія вобразы" калі і змяніліся, то хутчэй нязначна.

> *Калі вобраз і памяняўся, то не моцна, хіба толькі нейкія дэталі. Вобраз быў добры і ў прынцыпе такім застаўся. Да таго ж беларусы з палякамі дапамагалі ўкраінцам.*
>
> *Польшча, рэспандэнтка ва ўзросце да 30 гадоў.*

Таксама не вельмі змяніліся "беларускія вобразы" і ў Грузіі – пасля невялікага эмацыйнага ўсплёску 2022-га года "нацыянальны чыннік" у паўсядзённых ацэнках людзей знік. Цяпер праз большую ўвагу (безумоўна станоўчую) да ўкраінцаў і (хутчэй адмоўную) да расейцаў "беларускія вобразы" актуалізуюцца не як такія, а адносна іншых – праз адасабленне ад расейцаў і праз дапамогу ўкраінцам і Украіне.

> *У 2022-ім усё памянялася. Беларусь стала краінай-агрэсарам, нам прад'яўлялі: "Чаму не пратэстуеце?.." Цяпер негатыў ужо сышоў, нацыянальнасць стала граць меншую ролю. Толькі калі для расейцаў.*
>
> *Грузія-Польшча, рэспандэнтка ва ўзросце да 30 гадоў.*

Што тычыцца літоўскага кейса, то тут і 2020-ты, і 2022-гі гады шмат у чым сышлі ў нябыт. Як кажуць рэспандэнты:

> *...Калі адразу мы былі героямі, потым – ахвярамі, то пасля 2022-га года мы сталі суагрэсарамі. А цяпер становімся цяжарам, клопатам і пагрозай.*
>
> *Літва-Польшча, рэспандэнтка ва ўзросце да 30 гадоў.*

Важна, што асноўнымі складнікамі такога вобраза з'яўляюцца наўпрост маштаб беларускай іміграцыі ў Літву і яе ўяўны "радыкальны ліцвінізм". Такія чыннікі, як, напрыклад, крызіс з мігрантамі на беларуска-літоўскай мяжы альбо роля рэжыму Лукашэнкі ў актуальных працэсах, шмат у чым застаюцца па-за ўвагай.

Яшчэ адным фактарам, які ўскладняе літоўскі кейс, з'яўляецца гістарычна-палітычны складнік, паводле якога беларуская гісторыя пачынаецца толькі крыху больш за 100 гадоў таму. Менавіта ён знаходзіцца ў падмурку ўспрыняцця і Беларусі як краіны, і беларусаў як нацыі. У экстрэмальным варыянце можа адмаўляцца фактычнае існаванне і аднаго, і другога: Беларусі як самастойнай дзяржавы праз падпарадкаванасць Расеі; беларусаў – праз іх татальную русіфікацыю і страту нацыянальнай ідэнтычнасці.

> *Беларусь ім не вядомая і не самая зразумелая краіна, якая, незразумела, ці існуе па-за кантэкстам Расеі… (Беларусы як) нейкая маса – нібыта з імі ніколі не варагавалі. Але сумесная дзяржава? Пра гэта гаворкі не ідзе. З беларусамі можна суіснаваць з пазіцыі старэйшага брата. Яны не надта цікавыя, але суіснаваць з імі можна.*
>
> *Літва, рэспандэнт ва ўзросце 30-50 гадоў.*

Гэта значыць, калі польскі погляд на беларускія падзеі 2020-2021 і наступных гадоў выклікае параўнанне з эпохай "Салідарнасці" і спачуванне барацьбітам з рэпрэсіўнай сістэмай, то літоўскі бок робіць параўнанне нават не з "Саюдзісам", а з падзеямі студзеня 1991-га года. У выніку, калі палякі разумеюць цяжар змагання беларусаў з карнікамі варожага рэжыму, то літоўцы могуць высоўваць прэтэнзіі адносна таго, што беларусы не перамаглі за лічаныя дні.

# КАНАЛЫ ЎПЛЫВУ

Зыходзячы з аналізу адказаў рэспандэнтаў, можна меркаваць, што існуюць тры асноўныя каналы фармавання "беларускіх вобразаў":

- трэнды ў лакальных інфапрасторах;
- мінулы (у тым ліку сямейны) досвед кантактаў чалавека з беларусамі;
- мерапрыемствы беларускай дыяспары (розных яе суб'ектаў).

У парадку дня лакальных медыясфер, у якіх прысутныя меркаванні як афіцыйных уладаў, так і незалежных медыясуб'ектаў, беларускія пытанні звычайна знаходзяцца далёка не на першых пазіцыях. Выключэнні здараюцца, але не часта, і наступныя падзеі перакрываюць сабой папярэднія.

Адзінай краінай, дзе цяпер “беларускае пытанне” паднятае на высокі інфармацыйны ўзровень, з’яўляецца Літва (праз прасоўванне пэўнымі сіламі праблемы “ліцвінізму”).

> *Цяпер беларусы сталі згадвацца ў літоўскіх медыях вельмі часта. Але артыкулы не столькі супраць Лукашэнкі – хаця гэта таксама ёсць – колькі гісторыі кшталту: двое пабіліся ў бары, адзін з якіх беларус, які крычаў нешта супраць Літвы. Асвятляецца дзейнасць Сейма, парламента, у якім агучваюцца захады супраць беларусаў.*
>
> *Літва-Польшча, рэспандэнтка ва ўзросце да 30 гадоў.*

У Грузіі ж, з аднаго боку, беларускіх пытанняў у парадку дня няма. З іншага боку, прарасейская пазіцыя кіроўнай партыі ўсё роўна адчуваецца, напрыклад, на ўзроўні абмежаванняў у камунікацыі дзяржструктур з беларускімі НКА.

> *...Ёсць нюансы. З намі на супрацоўніцтва ідуць у асноўным апазіцыйныя партыі і НКА. А грузінскія ўлады глядзяць на гэта скоса.*
>
> *Грузія, рэспандэнт 30-50 гадоў.*

У Польшчы беларускія пытанні цяпер таксама не прасоўваюцца, але тут захавалася інерцыя леташняй інфармацыйнай кампаніі, у межах якой тлумачыліся станоўчыя перспектывы “высакаяскаснай” – інтэлектуальнай і працоўнай – міграцыі з Беларусі.

> *Актыўная маладая адукаваная хваля міграцыі, у адрозненне ад хвалі ўкраінцаў з Данбаса пасля 2014-га года, палякі параўноўвалі – і выбар на нашу карысць. Айцішнікі нашы, гаварылася, падаткі будуць плаціць. Можа, спачатку і скептычна палякі да нас ставіліся, але якасны складнік, дзяржпраграмы, нацэленыя на падтрымку інтэлектуальнай міграцыі, – ствараўся наратыў аб высокаадукаванай і высокапрыбытковай міграцыі, гэты наратыў трансляваўся з боку дзяржавы.*
>
> *Польшча, рэспандэнт 30-50 гадоў.*

Досвед асабістых кантактаў з беларусамі (пэўна, тут можна казаць і пра так званыя слабыя сувязі[1]) з’яўляецца адным з тых інструментаў, што аказвае доўгатэрміновы па часе ўплыў на фармаванне “беларускіх вобразаў”.

Рэспандэнты неаднаразова адзначалі, што на ўзроўні міжасабовых кантактаў з мясцовым насельніцтвам (прычым ва ўсіх краінах) беларусы як народ маюць хутчэй добрую рэпутацыю, праз што адчуваюць часцей нейтральнае ці нават пазітыўнае стаўленне з боку суразмоўцаў. Шмат у чым так атрымоўваецца за кошт папярэдняга досведу кантактаў з беларусамі. У гэтым сэнсе, як казаў адзін з рэспандэнтаў, важна “не запляміць рэпутацыю”.

1 Granovetter, M. S. (1973) «The strength of weak ties». American Journal of Psychology, 78 (6), pp. 1360–1380.

Захады, якія робіць дыяспара па фармаванні беларускіх вобразаў ці па прасоўванні беларускіх пытанняў у мясцовы парадак дня, можна падзяліць на тры групы:

- Супраца з мясцовымі медыямі – даволі актыўная раней, а цяпер, на жаль, практычна згорнутая (прынамсі ўзровень непараўнальны з тым, які быў у 2020-2021 гадах).
- Масавыя вулічныя акцыі – гэта пераважна альбо антываенныя акцыі і падтрымка Украіны, альбо акцыі салідарнасці з ахвярамі беларускага рэжыму. Гэткія акцыі маюць інфармацыйнае суправаджэнне для мясцовых жыхароў (да гэтага напрамку можна дадаць прэзентацыі ў гарадской прасторы буйных гарадоў інфармацыі пра беларускіх палітвязняў).
- Стацыянарныя імпрэзы – з той ці іншай рэгулярнасцю праводзяцца ў пэўных месцах (часцей у памяшканнях, радзей пад адкрытым небам) і звычайна маюць адукацыйна-культурніцкі кірунак. Мэтавымі аўдыторыямі такіх мерапрыемстваў традыцыйна з'яўляюцца даволі абмежаваныя групы: мясцовая інтэлігенцыя, студэнцтва, калегі-актывісты з мясцовых НКА/НДА, выпадковыя мінакі і г.д.

Варыянт непасрэднай супрацы з уладамі краін пражывання амаль не згадваўся рэспандэнтамі. Пэўна, гэты фармат уздзеяння на “беларускія вобразы” прадстаўнікі беларускіх дыяспаральных суполак і НКА пакідаюць беларускім дэмакратычным сілам/апазіцыйным структурам. Выключэнне складаюць хіба толькі прадстаўнікі беларускай дыяспары ў Грузіі. Праз адсутнасць у гэтай краіне якога-небудзь прадстаўніцтва беларускага палітычнага блока менавіта актывісты дыяспаральных суполак намагаюцца прасоўваць беларускія пытанні ў Грузіі, самастойна адвакатаваць і лабіяваць інтарэсы дыяспары.

Асобнае пытанне, якое закраналася ў даследаванні, – гэта ўзаемадзеянне беларусаў з прадстаўнікамі іншых новых дыяспар, якія з'явіліся пасля 2022-га года (украінскай і расейскай). Высветлілася, што міждыяспаральныя кантакты хутчэй мінімальныя. Калі яны і ствараюцца, то дзякуючы пэўным міжасабовым кантактам, а не сектаральнаму арганізацыйнаму ўзаемадзеянню.

Нават сярод дыяспаральных суполак беларусаў, украінцаў і расейцаў, якія, як падаецца, маюць агульныя каштоўнасці і праблемы, ніякай супрацы фактычна няма. У выпадку з украінскімі арганізацыямі і суполкамі беларусы адзначаюць амаль аўтаматычную рэакцыю недаверу і асцярогі з іх боку. Каб пераадолець такое стаўленне да сябе, часцяком патрабуецца шмат высілкаў і часу, але і гэта не заўсёды дае свой плён. Адносна расейскіх арганізацый рэспандэнты адзначаюць і невялікую колькасць кантактаў, і перыядычныя непаразуменні ў стасунках, выкліканыя “неад'емнай імперскасцю” нават ліберальных па каштоўнасцях расейцаў.

Да таго ж некаторыя рэспандэнты выказвалі думку аб тым, што дыяспаральныя суполкі нізавога ўзроўню ўкраінцамі і расейцамі ствараюцца ў значна меншай ступені, чым у беларусаў.

# ПРАБЛЕМЫ

Калі пакінуць за дужкамі пытанні, на якія ў часам паўплываць немагчыма, то сярод праблем, звязаных з фармаваннем беларускіх вобразаў, рэспандэнты адзначаюць наступнае:

- Пэўныя захады па фармаванні беларускіх вобразаў цяпер калі і робяцца, то гэта адбываецца ініцыятыўным чынам і хутчэй спантанна, без аніякага стратэгічнага плана ці ўзгаднення высілкаў з беларусамі з іншых суполак і грамадскіх сектараў. Выключэнні складаюць антываенныя акцыі і мерапрыемствы агульнабеларускага маштабу і значэння, напрыклад імпрэзы ў гонар 9-га жніўня 2020-га года ці рэакцыі на смерць беларускіх палітычных зняволеных.
- Фрагментацыя беларускай дыяспары – маецца на ўвазе невялікая колькасць сувязяў і супольных праектаў як паміж дыяспаральнымі суполкамі нават у межах адной краіны (у Грузіі з трансгарадскімі сувязямі сітуацыя істотна лепшая), так і паміж рознымі сектарамі і сферамі беларускай грамадскай супольнасці.
- Адсутнасць агульнай схемы па інфармацыйнай працы як дыяспары ў прыватнасці, так і дэмакратычных сіл агулам. Зразумела, ёсць пытанне, ці магчыма ўвогуле прапісаць такую сістэму? Але ж цалкам магчыма як мінімум сінхранізаваць пазіцыі ці акрэсліць асноўныя прынцыпы, кірункі і сэнсы для накіраванай на перспектыву інфармацыйнай працы[2].
- Пераважная фіксацыя на негатыўных складніках наступстваў падзеяў 2020-2021 гадоў: рэпрэсіі, уцякацтва, супраціў рэжыму-суагрэсару і г.д. Гэта, безумоўна, трэба рабіць, але для павышэння эфектыўнасці інфармацыйнай працы крытычна не хапае пазітыўных складнікаў для прасоўвання ў лакальны парадак дня.

Да вызначаных праблем можна дадаць і пэўную закрытасць беларускіх арганізацый, іх засяроджанасць на беларускіх пытаннях ці дыяспаральных праблемах. З аднаго боку, гэта зразумела, з другога боку, такая сканцэнтраванасць на ўнутраных пытаннях не вельмі спрыяе прасоўванню беларускіх пытанняў у мясцовых медыях.

Да таго ж трэба падкрэсліць і такі важны нюанс: калі беларускія арганізацыі працуюць на пашырэнне інфармацыі аб Беларусі і аб тым, што ў ёй адбываецца, то такія захады звычайна арыентуюцца на кантэкст, які выходзіць за межы адной пэўнай краіны. Гэта праяўляецца, прынамсі, у выкарыстанні пераважна англійскай мовы падчас прэзентацыі сваёй дзейнасці. Такая недаацэнка важнасці мясцовай мовы часцяком спалучаецца з выпадзеннем з-пад увагі ці, больш правільна, няведаннем асаблівасцяў мясцовай гісторыі, культуры, менталітэту і г.д. Пра моўнае пытанне мусім адзначыць яшчэ адзін прынцыповы момант: неабходна пашыраць выкарыстанне беларускай мовы. Пры ўсім нібы касмапалітызме ліберальна-дэмакратычных каштоўнасцяў, ні англійская мова, ні тым больш расейская не будуць спрыяць павазе да беларусаў як да нацыі і грамадства, асабліва на былых постсавецкіх прасторах.

2 У дадатак да 2-3 існых тэм-тэзісаў аб таталітарным рэжыме Лукашэнкі, рэпрэсіях у краіне і палітвязнях, а таксама аб дэмакратычных каштоўнасцях і праеўрапейскім выбары прагрэсіўных беларусаў.

# ВЫСНОВЫ І РЭКАМЕНДАЦЫІ

Дзейнасць беларусаў замежжа дзеля фармавання адзінага вобраза Беларусі цяпер немагчымая праз існаванне ў свядомасці мясцовых жыхароў некалькіх актыўных суб'ектаў, якія маюць свой асабісты сэнсавы багаж: а) беларуская дзяржава/рэжым Лукашэнкі; б) беларускае грамадства, якое незадаволенае Лукашэнкам; в) беларуская дыяспара, што колькасна вельмі павялічылася за апошнія гады; г) асобныя беларусы як прадстаўнікі і прадстаўніцы беларускага народа.

Ва ўспрыняцці кожнага з гэтых вобразаў уплыў беларускіх пратэстаў 2020-2021 гадоў фактычна сышоў на нуль. Зараз найбольш актуальнымі з'яўляюцца два фактары ў тым ці іншым спалучэнні: 1) саўдзел Беларусі як дзяржавы (рэжыму) ў расейскай агрэсіі супраць Украіны; 2) успрыняцце беларускіх вобразаў праз прызму ўласнай гісторыі, альбо дзяржаўнай, альбо асабістай.

На фармаванне беларускіх вобразаў у краінах пражывання беларусы замежжа намагаюцца ўплываць у асноўным праз правядзенне масавых вулічных акцый і больш камерных імпрэзаў. Асноўнымі сэнсамі, якія прасоўваюць беларусы, з'яўляюцца: размежаванне беларускага грамадства і рэжыму Лукашэнкі; асуджэнне вайны і падтрымка Украіны; палітвязні і памеры рэпрэсій у Беларусі.

Фактычна гэта ўсё тое, што намацвалася яшчэ ў 2021-2022 гадах. З таго часу чагосьці новага амаль не з'яўляецца. Рэспандэнты адзначаюць, што для прасоўвання беларускіх вобразаў вельмі не хапае пазітыўных і арыентаваных на перспектыву складнікаў.

Увогуле рэспандэнты моцна адчуваюць адсутнасць сістэмных захадаў па стварэнні нейкага агульнага для дыяспараў і НДА наратыву, які мусіць неяк больш-менш супольна прасоўвацца для небеларускай аўдыторыі. Яшчэ адзін важны недахоп: адсутнасць увагі да лакальных моў, кантэкстаў, гісторыі.

З улікам вышэй сказанага ў якасці шляхоў аптымізацыі працы па фармаванні беларускіх вобразаў можна вызначыць наступнае:

- Стварэнне/узмацненне сувязяў паміж асноўнымі суб'ектамі беларусаў у выгнанні: між палітычнымі дзеячамі, НКА, лакальнымі дыяспаральнымі суполкамі, прычым як паміж суб'ектамі аднаго кшталту, так і паміж рознымі сектарамі.
- Выпрацоўка калі не агульнага наратыву па беларускіх вобразах, то хаця б сінхранізацыя асноўных тэзісаў для іх супольнага прасоўвання, напрыклад праз дыяспаральныя канферэнцыі ці супрацу народных амбасад (кшталту "7 тэзісаў аб тым, што за 5-10 хвілін трэба распавесці суразмоўцу пра Беларусь і беларусаў").
- Арыентавацца на лакальныя супольнасці канкрэтных краін са сваёй мовай, гісторыяй, палітычнай сітуацыяй.
- Падрыхтоўка і пашырэнне пула экспертаў з розных сфераў, якія пры адпаведных нагодах могуць каментаваць звязаныя з Беларуссю падзеі ў мясцовых медыях і на мясцовых мовах.
- Прасоўванне беларускіх вобразаў як традыцыйнымі (у медыях, праз масавыя і кулуарныя акцыі і імпрэзы, у міжасабовай камунікацыі), так і нечаканымі шляхамі, напрыклад праз увядзенне беларускага досведу ў навучальныя ці экспертныя матэрыялы.
- У паўсядзённых стасунках больш выкарыстоўваць мясцовыя і беларускую мовы.

# МЕТОДЫКА І ВЫБАРКА

Даследаванне праходзіла ў лютым-сакавіку 2024-га года. Метадам даследавання сталі глыбінныя інтэрв'ю. Глыбінныя інтэрв'ю з'яўляюцца якасным метадам даследавання, які не прадугледжвае рэпрэзентатыўнасці. Прызначэнне глыбінных інтэрв'ю – гэта распрацоўка/акрэсленне сэнсаў, меркаванняў, ацэнак адносна пэўнай праблемы, то бок стварэнне палітры варыянтаў без вызначэння іх колькаснай ці долевай прадстаўленасці.

Агулам у даследаванні бралі ўдзел 12 чалавек. Гэта беларускія актывісты (6 мужчын, 6 жанчын), якія тым ці іншым чынам удзельнічалі ў падзеях 2020-га года, а цяпер датычныя да працы беларускіх арганізацый у выгнанні.

Ад беларускіх актывістаў у Польшчы падключыліся 5 рэспандэнтаў, ад літоўскіх – 3 рэспандэнты, з Грузіі – 1 рэспандэнт. Разам з тым некалькі чалавек мелі досвед працяглага пражывання ў некалькіх краінах: спачатку ў Грузіі, пасля ў Польшчы – 2 рэспандэнты; спачатку ў Літве, пасля ў Польшчы – 1 рэспандэнт. Такія рэспандэнты былі крыніцамі інфармацыі па дзвюх краінах.

| Краіна | Колькасць крыніц |
|---|---|
| Польшча | 8 |
| Літва | 4 |
| Грузія | 3 |

# ПРА АЎТАРА



**Генадзь Коршунаў** – старэйшы даследчык Цэнтра новых ідэй.

Мае ступень PhD сацыялагічных навук, спецыялізуецца на аналізе грамадскай думкі. Асноўныя напрамкі даследавання: сацыяльныя структуры, працэсы і інстытуты, сацыялогія рэвалюцыі, працэсы нацыянальнага будаўніцтва, дынаміка медыяпрасторы.

*Кантакт: korshunau@newideas.center*

---

**Цэнтр новых ідэй** – аналітычны цэнтр, праца якога прысвечана магчымасцям развіцця і адказам на выклікі, якія стаяць перад Беларуссю ў XXI стагоддзі.

Наша місія – дапамагчы палітычным і грамадскім арганізацыям пабудаваць больш адкрытую, квітнеючую і ўстойлівую Беларусь.

*www.newideas.center*

Фота: Razam e.V.